# Учора савецкі народ урачыста адзначыў Дзень касманаўтыкі

**СЛАВА САВЕЦКІМ ВУЧОНЫМ, КАНСТРУКТАРАМ, ІНЖЫНЕРАМ, ТЭХНІКАМ І РАБОЧЫМ — СТВАРАЛЬНІКАМ ВЫДАТНЫХ КАСМІЧНЫХ КАРАБЛЁЎ!**

**СЛАВА ДОБЛЕСНЫМ САВЕЦКІМ КАСМАНАЎТАМ!**

(З заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1963 года).


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (522) Субота, 13 красавіка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы


## Там, дзе жыў К. Цыялкоўскі

КАЛУГА. Землякі геніяльнага тэарэтыка міжпланетных падарожжаў К. Э. Цыялкоўскага шырока адзначылі Дзень касманаўтыкі. На прадпрыемствах, у клубах, школах, агітпунктах, кінатэатрах праводзіліся лекцыі і гутаркі, наладжаны выстаўкі, дэманструюцца фільмы, прысвечаныя перамогам савецкага народа ў асваенні космасу. У адным з пастаянна дзеючых агітпунктаў з лекцыямі «Ідэі К. Э. Цыялкоўскага ажыццяўляюцца» выступіў унук вялікага вучонага Аляксей Косцін.

Мнагалюдна ў гэтыя дні ў Доме-музеі К. Э. Цыялкоўскага. Тут можна сустрэць экскурсантаў з Масквы, Ленінграда, Украіны, Сібіры, Паволжа, Крайняй Поўначы і іншых месц. З цікавасцю знаёмяцца яны з навуковай спадчынай вялікага вучонага, аглядаюць мадэлі ракет і касмічных караблёў, макет першага штучнага спадарожніка Зямлі, копію вымпела, закінутага на Месяц савецкай ракетай, мадэль аўтаматычнай станцыі, якая сфатаграфавала нябачны бок начнога свяціла, месячны глобус.

Музей папоўніўся новымі экспанатамі. Вядомы савецкі авіяканструктар О. К. Антонаў прыслаў мадэль свайго новага турбавінтавога пасажырскага самалёта «АН-10А», Павел Паповіч— кнігу «У космасе — двое».

## Паведамленне аб скліканні Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС

**ЦК КПСС прыняў рашэнне склікаць чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС 28 мая 1963 года.**

**На абмеркаванне Пленума ЦК уносіцца пытанне: «Чарговыя задачы ідэалагічнай работы партыі». Дакладчыкам зацверджан сакратар ЦК КПСС т. Ільічоў Л. Ф.**

**У рабоце Пленума ЦК прымуць удзел кіруючыя партыйныя і савецкія работнікі, дзеячы літаратуры і мастацтва, работнікі навукі, народнай асветы, друку, радыё, тэлебачання і іншыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі з рэспублік, краёў і абласцей.**

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

## Аб узнагароджанні газеты „Знамя юности" Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

За вялікую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі і ў сувязі з 25-годдзем з дня выхаду першага нумара ўзнагародзіць газету «Знамя юности» Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
**В. КАЗЛОЎ.**

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
**Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

9 красавіка 1963 года
гор. Мінск.

## *Пісьмо ад чэшскіх сяброў*

Прага, 15-га сакавіка 1963 г.

Беларускі дзяржаўны універсітэт
імя Леніна
МІНСК

Дарагія сябры!

Прыміце, калі ласка, шчырую ўдзячнасць за прывітанне, якое прыслана Карлаву універсітэту калектывам прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна з савецкай эстафетай дружбы 1962 г.

Навуковыя і педагагічныя работнікі Карлава універсітэта добра ведаюць і высока цэняць вялікія поспехі, якіх пастаянна дасягае Ваш універсітэт у галіне навукі і ў справе выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў. Мы ганарымся тым, што абодва нашых універсітэты звязаны вузамі моцнай дружбы, што нашы мэты ў агульнай справе будаўніцтва сацыялізма і камунізма вельмі блізкія і што вучоныя нашых універсітэтаў могуць сумесна рашаць важныя навуковыя праблемы.

Жадаем Вам, дарагія сябры, далейшых поспехаў у Вашай навуковай і педагагічнай рабоце, якая прыносіць такую вялікую карысць для народаў Вашай цудоўнай Радзімы і ўсяго чалавецтва.

Рэктар Карлава універсітэта.

# Калектыў—лепшы дарадчык і сябра

Сакратары партыйных і камсамольскіх арганізацый, старшыні прафсаюзных бюро і куратары акадэмічных груп сабраліся ў мінулую сераду на нараду, каб абмеркаваць стан ідэйна-выхаваўчай работы ва універсітэце.

Сакратар партыйнага камітэта БДУ **Т. Я. Дударава** паведаміла сходу аб пленуме Ленінскага райкома партыі, на якім абмяркоўвалася пытанне ідэйна-выхаваўчай работы і востра крытыкаваліся грамадскія арганізацыі універсітэта за буйныя недахопы ў гэтай рабоце. Камсоргі і прафоргі не дапамагаюць куратарам, не працуюць у кантакце з імі. Так, зразумела, цяжка дабіцца добрых вынікаў. Дрэнна яшчэ ў нас праходзяць масавыя мерапрыемствы. Камсамольскія арганізацыі факультэтаў часта праходзяць міма амаральных учынкаў студэнтаў.

Далей Т. Я. Дударава расказвае аб уражанні аб паездцы ў ЛДУ ў складзе дэлегацыі абласнога камітэта КПБ. Ленінградцы двойчы ў год праводзяць грамадскія агляды. Робіцца гэта так: камсорг, прафорг і стараста пішуць характарыстыкі на кожнага студэнта. Затым на сходзе групы зачытваюць іх. Кожны выказвае сваю думку. Гэта дапамагае многім студэнтам выправіць свае памылкі ў паводзінах, вучобе, грамадскай рабоце.

Т. Я. Дударава прапаноўвае і ў нашым універсітэце арганізаваць такія агляды.

Выступіўшы затым сакратар камітэта камсамола фізфака **В. Стражаў** расказаў аб ганебнай практыцы правядзення палітінфармацый на факультэце. Звычайна рыхтуюцца да палітінфармацыі 2—3 чалавекі. Яны за некалькі хвілін да пачатку праглядзяць некалькі газет і пераказваюць іх змест. Наведваюць палітінфармацыі студэнты вельмі дрэнна. В. Стражаў расказаў, як аднойчы на палітінфармацыі прысутнічаў выкладчык Г. Г. Герасіменка і завязалася размова аб міжнародных падзеях. Гэтая размова заняла больш гадзіны, бо яна ўсіх цікавіла. Стражаў прапанаваў, каб на палітінфармацыях абавязкова прысутнічаў куратар.

Далей В. Стражаў расказваў, як камсамольцы факультэта змагаюцца за высокую наведваемасць заняткаў. На дошцы аб'яў яны вывешваюць спіс прагульшчыкаў і указваюць колькасць прапушчаных гадзін. Паведамляюць бацькам аб пропусках заняткаў іх дзецьмі. Гэта дапамагло. Пропускаў стала на 30—40 працэнтаў менш.

На трыбуне камсорг 1 курса геафака **Ванда Будкевіч.** Яна дзеліцца вопытам сваёй работы. Справа ў тым, што камсамольская арганізацыя факультэта — лепшая ва універсітэце. Тут праводзяцца тэматычныя вечары курсаў і факультэта. Першакурснікам вельмі спадабаўся адзін з такіх вечароў: «Наша група — калектыў». Студэнты 4 курса спрачаліся аб культуры паводзін савецкага маладога чалавека, аб рамантыцы ў прафесіі географа.

Вельмі змястоўным было выступленне выкладчыка гістфака **Ф. М. Нячая**. Ён закрануў пытанне аб антырэлігійнай прапагандзе. Студэнты самі, зразумела, атэісты. Але яны часта праходзяць міма фактаў, калі іх блізкія, суседзі калечаць розум сваіх дзяцей рэлігійным уплывам.

Яны могуць паехаць на рэлігійнае свята дамоў, забываючы аб тым, што яны гэтым міжволі падтрымліваюць рэлігійныя перажыткі ў свядомасці людзей, — прагчвае думку Ф. М. Нячая **А. Н. Нахімоўская,** выкладчык матфака. Яна таксама выступіла супраць фармальнага падыходу да справы. Яна раіць камсамольскім актывістам часцей звяртацца да старэйшых за дапамогай у цяжкіх выпадках, падтрымлівае прапанову аб правядзенні грамадскіх аглядаў.

Намеснік сакратара камітэта камсамола **Эрнст Лейкін** расказаў аб некаторых пачынаннях, прапановах студэнтаў, якія не знаходзяць сапраўднай падтрымкі. У пачатку навучальнага года была арганізавана школа лектараў па маральнаму кодэксу будаўніка камунізма. Але гэта патрэбная і цікавая справа заглохла. А ёсць жа загад міністэрства вышэйшай адукацыі, у якім гаворыцца аб тым, што кожны выпускнік ВНУ павінен мець, акрамя асноўнай, дзве—тры грамадскіх прафесіі.

Намеснік сакратара камітэта камсамола **Уладзімір Атрошчанка** прызваў усіх сабраўшыхся на сход быць узорам ва ўсім, тады студэнты будуць раўняцца на сваіх важакоў. Зараз камітэт камсамола рашае пытанне аб паездцы студэнтаў у час канікул на цаліну, аб стварэнні працоўных лагераў. Атрошчанка патрабуе больш увагі ўдзяляць рабоце СНТ, іншых студэнцкіх аб'яднанняў, якія зробяць жыццё студэнта больш разнастайным і захапляючым.

Сход закончыў сваю работу. З улікам усіх прапаноў ён рашыў праводзіць грамадскія агляды ідэйна-выхаваўчай работы , групах; палепшыць правядзенне палітінфармацый, удзельнічаць у іх павінен і куратар; групкамсоргам, парторгам, праforгам, куратарам усямерна паляпшаць ідэйна- выхаваўчую работу са студэнтамі непасрэдна ў групах.

Сход рашыў вельмі актуальнае пытанне. Сабраўся актыў універсітэта, разам разабраўся ў цяжкасцях, падзяліўся вопытам работы. Цяпер і працаваць будзе лягчэй, бо ведае кожны, што гэта ўжо надзейна, праверана калектывам, таварышамі. Хацелася б толькі, каб такія нарады праводзіліся рэгулярна. Яны прынясуць шмат карысці.

**Я. СМАЛЕНСКАЯ.**

У пяцікурснікаў цяпер гарачы час. Ідзе размеркаванне на работу, абарона дыпломных работ. Нашы карэспандэнты падрыхтавалі матэрыялы, якія расказваюць аб гэтых важных падзеях у жыцці універсітэта. Яны будуць надрукаваны ў наступным нумары газеты.



**На здымку:** выпускнік юрфака мінулага года **Іван Шаўчэнка.** Ён працуе цяпер у МЗС Украіны.

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

*У сераду адбыўся пленум камітэта камсамола БДУ, які рашыў арганізацыйнае пытанне. Пленум выбраў начальнікам штаба працоўных спраў Пятра Ерашкевіча (3 курс юрфака) замест А. Аляшкевіча, які перавёўся на завочнае аддзяленне. Адказным за работу дружыны выбран студэнт 1 курса юрфака Валерый Мітрафанаў.*

* * *

*На трэцім паверсе арганізаваны стэнд «Куба будуе сацыялізм». Фотадакументы стэнда расказваюць аб гераічнай барацьбе кубінскага народа, аб яго сённяшнім дне, аб працоўным гераізме народа.*

* * *

*Шашачны клуб універсітэта выпусціў свой бюлетэнь, які расказвае аб рабоце шашачных гурткоў і секцый у БДУ. Змешчаны таксама разнастайныя матэрыялы аб шашачных спаборніцтвах.*

## Фізкультура і спорт

# Баскетбалісткі рыхтуюцца да барацьбы

Вечар. Усё больш і больш цёмных вокнаў у галоўным корпусе. І толькі некаторыя свецяцца дапазна. Што ж робіцца за гэтымі вокнамі?

Чацвёрты паверх. Спортзала. Тут, змяняючы адзін аднаго, займаюцца студэнты: лёгкаатлеты, гімнасты, акрабаты. Сягодня аўторак, і з васьмі гадзін вечара ў спортзале гаспадараць баскетбалісткі зборнай. У яе складзе — супрацоўніцы універсітэта, студэнткі фізічнага, хімічнага, гістарычнага і іншых факультэтаў.

Пачынаецца трэніроўка. Розныя практыкаванні: для павышэння вынослівасці і хуткасці, для ўдасканалення тэхнікі і інш. Праводзяцца эстафеты: хто хутчэй выканае тое ці іншае заданне. І, зразумела, брaскі. Сто, дзвесці, трыста па кальцу з розных адлегласцей і рознымі спосабамі.

Цяпер нашы баскетбалісткі рыхтуюцца да матча мацнейшых каманд вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, які пачнецца 19 красавіка. Усе працуюць вельмі сур'ёзна. Своечасова прыходзяць на трэніроўкі, не прапускаюць заняткаў. Стала законам: непаспяваючы да трэніровак не дапускаецца.

Ёсць, канешне, у камандзе і непрыемнасці: у гэтым годзе ва універсітэт паступілі Ларыса Лабкоўская (фізфак) і Оля Дзмітрыева (хімфак), якія да гэтага гралі ў зборнай школьніц горада. А цяпер яны нідзе не трэніруюцца, і ўсё набытае раней губляецца. Капітан мінулагодняй зборнай Шура Самойлава (3 курс фізфака) перастала таксама наведваць трэніроўкі. Хацелася б, каб дзяўчаты сур'ёзна падумалі аб сваім учынку.

Але каманда настроена па-баявому. Дзевяць жа чалавек з 13 «зборнікаў» — першакурсніцы.

У тым, што каманда з першых дзён свайго існавання стала добрым калектывам, вялікая заслуга яе трэнера Георгія Міхайлавіча Грудо, чалавека, усё жыццё якога звязана з баскетболам. У 1949 годзе ён скончыў тэхнікум фізічнай культуры і ў тым жа годзе паступіў у ІФК. Вучыўся, іграў у зборнай рэспублікі і адначасова трэніраваў спартсменаў былога юрыдычнага інстытута. У 1955 — 1959 гадах ён з'яўляецца трэнерам жаночай зборнай каманды рэспублікі. Цяпер трэці год Георгій Міхайлавіч працуе ва універсітэце. Ён вельмі задаволены атмасферай дружбы, якая пануе ў камандзе.

Наша зборная неаднаразова спрабавала свае сілы ў афіцыяльных і таварыскіх сустрэчах. У першынстве спартклубаў горада яна заняла 4 месца. Выйграе таварыскія сустрэчы ў юнакоў БДУ і дзяўчат ДСШ універсітэта, праіграе пакуль што мужчынская зборнай універсітэта.

Колеры зборнай жаночай баскетбольнай каманды БДУ абараняюць Таня Андрэева (3 курс матфака), Оля Зелянцова, Галя Петухова і Ніна Шарова (1 курс фізфака), Света Жырухіна і Неллі Лойка (1 курс гістфака), Наташа Крысевіч (4 курс біяфака), Неллі Прысмакава (1 курс матфака), Яня Смаленская (1 курс філфака), Зіна Ціток (супрацоўніца).

Праверкай боегатоўнасці каманды з'явяцца сустрэчы з майстрамі Вільнюскага універсітэта і з баскетбалісткамі Вільнюскага пединстытута. На гэтыя ігры баскетбалісткі (а таксама і баскетбалісты) выязджаюць сёння ў сталіцу Літвы.

**С. СМОЛКУС.**

# Выйшаў чарговы нумар

**У гэтым навучальным годзе — гэты восьмы нумар. І адразу вакол яго сабраліся юнакі і дзяўчаты—студэнты біяфака. Пачаліся гарачыя спрэчкі. Некаторыя заметкі выклікалі вясёлыя ўсмешкі. А тут — стоп! — трэба падумаць. Газета ўздымае сур'ёзнае пытанне.**

**144 разы студэнты збіраліся вось так ля стэнда насценнай газеты «За мічурынскую біялогію». Колькі год ужо біёлагі гавораць: «Наша «Мічурынка» самая лепшая!».**

**Давайце паглядзім, што піша газета на сваіх старонках. Вось перадапошні нумар. Пад рубрыкай «Паспрачаемся!» камсорг факультэта Ніла Дароніна прапануе правесці дыспут аб густах. Свае прапановы кожны можа перадаць у рэдкалегію. Радуе разнастайнасць жанраў — тут і простая заметка, і нарыс аб выдатніцы вучобы, і гумар, і фельетон. Матэрыялы змяшчаюцца пад рубрыкамі: «Даўно, сябры вясёлыя...», «Ці бываеш ты ў роднай школе?», «Калі ты біёлаг» і інш. Закранаюцца ўсе бакі студэнцкага жыцця: вучоба, адпачынак, спорт... У газеце рэгулярна выступае многа аўтараў, шмат студэнтаў удзельнічае ў выпуску насценгазеты, таму і чытаць яе цікава.**

**Апошні нумар рэдакцыйная калегія прысвяціла сустрэчы выпускнікоў факультэта з цяперашнімі студэнтамі. Газета дасылае сардэчныя пажаданні выпускнікам Аляксандру Астапеня, які цяпер з'яўляецца аспірантам, В. Гайдуку, Л. Хадарэнка, У. Клакоцкаму, усім выпускнікам факультэта. Станоўча, што газета змяшчае каля пятнаццаці фотаздымкаў выпускнікоў біяфака.**

**Газета «За мічурынскую біялогію» выходзіць двойчы ў месяц. Усялякая творчая праца — гэта перш за ўсё карпатлівая і настойлівая праца. Па твару газеты бачна, што творчы калектыў «Мічурынкі» менавіта працуе старанна. Члены рэдкалегіі добра ведаюць, што працаваць павінны яны, а не чытач.**

**К. КАНУС.**

*Аддзел сатыры і гумару*

# „Танцуй, танцуй, выкрэнцай"

Фельетон

Аб чым пойдзе размова, вы ужо здагадаліся? Канешне, аб танцах. Які студэнт не любіць бяручых за сэрца мелодый вальса, студэнцкага ці школьнага, імклівага факстроту! «Танцуй, танцуй, выкрэнцай...». Нават мяне, не вельмі здольнага да танцаў хлопца, гэтыя мелодыі штурхаюць у круг тацуючых, загадваючы: «Ідзі, станцуй, хлопча!». Але дзе там! Мне ніяк не ўдаецца завіхрыцца ў вальсе, адпачыць у плаўным танга. Увесь настрой сапсаваў універсітэцкі вечар адпачынку, які адбыўся 5 красавіка. А якое страшэннае жаданне было танцаваць! Не, я не кажу, што не было танцаў. Як жа, некаторыя хлопцы кашулі выкручвалі пасля чарльстона. Затое я і многія другія засталіся сухімі. Цэлы вечар прастаяў я ў куточку назіраючы і за «броўнскім рухам» хімікаў на сустрэчы выпускнікоў факультэта са студэнтамі...

І вось нярвова забіў барабан, засмяяўся саксафон, зароў, як звер, кантрабас. Ну, думаю, вальс рэзнуць хлопцы. І рэзнулі... ды такі чарльстон, што падлога захісталася, вокны задрыжэлі, падвешаныя ўверсе шары заскакалі. «Вось табе і на, — падумаў я.— Зноў гэты д'яблаў чарльстон танцуецца».

А як танцуецца, хочаце, раскажу. Псуюць на вачах танец, як казлы-нягоднікі маладыя саджанцы! Вось схапіў юнак сваю партнёршу-дзяўчыну, рвануў яе з месца і папёрся, як выяздовы конь з брычкаю, і давай усяляк здзекавацца з яе. То за адну руку турзяне (з боку здаецца што вывіх пляча ліквідоўвае), то за другую пацягне, то нагамі заляпеча, як гусь, гонячыся за хлапчуком. Во, як танцуюць. А аб фізіяноміі і гаварыць не прыходзіцца. Юначая студэнцкая постаць у танцы скручваецца ў тры пагібелі. «Хадзячы пітэкантрап,— пачуў я з боку, — перастань выкрыўляцца!».

— Злазь з гонту, не псуй даху, — дадаў народным афарызмам высокі юнак, што стаяў поруч са мной.

І вы думаеце, на вашы словы звернуць увагу Рыгор Сарэбраны з 2 курса фізфака, або Ада Булацкая з філфака і некаторыя іншыя гора-танцоры? На вашу заўвагу яны адкажуць не словам, а справай: яшчэ больш стануць выкрыўляцца...

А тым часам заціхла музыка. О, не, то не адна пара так танцавала. Часценька такое заўважыш на універсітэцкіх вечарах.

А хто заўважыць? Усялякі, толькі не дружыннікі, якія дзяжураць на вечары. Яны і вухам не павядуць, што там рэжа матфакаўскі джаз. «Даеш чарльстон!» — крычаць стылягі музыкантам. «Даём, даём», — выпаляць «джазісты». І зноў захісталася падлога, задрыжэлі шыбы, заскакалі шары...

Чарльстон за чарльстонам — гэта ўжо ледзь не традыцыя на нашых вечарах. А дзе ж вальсы, фактроты, танга? Няўжо нашы студэнты спісалі гэтыя танцы з рахунку? Не! Ды справа і не ў гэтым. Танцаваць трэба і чарльстон. Але танцаваць па-сапраўднаму, правільна.

Па-новаму, зусім па-новаму павінна падыйсці камсамольская арганізацыя універсітэта да арганізацыі вечароў адпачынку. А пускаць гэтую справу на самацёк — значыць кідаць ценю на гонар універсітэцкага калектыву.

**Даніла ШЫЛА.**

# З днём нараджэння, Анатоль!

Празвінеў званок. Закончылася апошняя лекцыя. Па аўдыторыі паплыў шорах збіраемых канспектаў, падручнікаў. Раптам раздаўся голас старасты групы Яўгена Гарэліка.

— Таварышы, не разыходзьцеся.

Усе прыціхлі, і Жэня працягваў, звяртаючыся ўжо непасрэдна да Анатоля Каліціеўскага:

— Ад імя ўсёй групы віншую цябе з днём нараджэння. Дазволь уручыць табе наш сціплы студэнцкі падарунак...

Пад апладысменты аднакурснікаў Анатоль атрымоўвае два томікі кніг і плюшавага мішку. Усхваляваны і радасны, Анатоль горача дзякуе таварышам за падарунак, за ўвагу, за дружбу, вялікую і сапраўдную.

Такое ўжо стала традыцыяй на першым курсе аддзялення журналістыкі...

Памятаю першыя дні заняткаў, месяц работы ў саўгасе «Волма». У групу прыйшлі людзі, розныя па ўзросту, па прывычках, па густах. Юрый Сапажкоў думае і жыве вершамі, Анатоля Каліціеўскага праследуюць шахматныя эцюды, Віталій Луцэнка любіць расказаць аб сабраным для карэспандэнцыі матэрыяле. Адзін любіць музыку, другі захапляецца жывапісам, трэці гатоў начамі праседжваць над кнігай. І усё ж наш калектыў аб'ядноўвае адно— ДРУЖБА.

Яна ўзнікла не сама па сабе. Яе расцілі клапатліва і беражна. Успамінаецца работа ў саўгасе. Халоднае, прыпудранае інеем, засцекляneўшае бацвінне морквы. Вырвеш адну, другую, трэцюю морквіну, і вось ужо пальцы замерзлі, не згінаюцца. Хочацца сунуць іх у гарачае полымя кастра. Але кастра няма, а працаваць трэба.

Так было дзень, два. На трэці перад пачаткам работы аб гэтым загаварыў наш партгрупорг Віталій Луцэнка.

— Так нельга. Мы прыехалі ў саўгас на які-небудзь месяц і не можам паказаць сябе?! А як жа рабочыя саўгаса? Не такія людзі? Такія! І працуюць і ўзімку і ўлетку. А мы хіба не можам?

І вось паявіліся першыя спаборнічаючыя. Лена Наўменка за дзень выканала дзве нормы. Яе сталі даганяць Яўген Прыгодзіч, Уладзімір Бабраўнічы. Іскрынка дружбы разгаралася вялікім, цудоўным полымем. Увечары змораныя, але задаволеныя, рабяты разыходзіліся па дамах, ішлі ў сталоўку вячэраць. А потым разам затрымліваліся ў клубе, спявалі песні, чыталі вершы—спачатку класікаў, а потым, калі звыкліся, пазнаёміліся бліжэй, — і свае.

Аднойчы з раніцы Лена Наўменка не выйшла на работу. А ўвечары да яе прыйшлі таварышы, прынеслі пячэнне, цукеркі. Лена была хворая. Не, не цукеркі, а ўвага таварышаў, іх клопаты ўсхвалявалі дзяўчыну. З добрымі, сапраўднымі людзьмі звяло яе жыццё.

Так пачыналася дружба. А калі вярнуліся ў аўдыторыі, яе агеньчык не патух. У групе адразу ж адмовіліся ад сухой афіцыяльнасці. Замест доўгіх і сумных шматгадзінных сходаў — гарачыя лятучкі.

...На экраны выйшаў фільм «Калегі». Нехта прапанаваў:

— Давайце сходзім, паглядзім...

І ўся група паглядзела фільм, а потым — спрэчкі, шум, і ў рэшце рэшт адзіная думка — выдатны твор кінамастацтва.

У мастацкім музеі — выстаўка твораў класікаў жывапісу і майстроў прыкладнога мастацтва. Пачынаючыя журналісты не маглі не наведаць яе. Столькі новага, незвычайнага, гама пачуццяў, фарбаў і ўражанняў. Усе 27 студэнтаў групы разам з кіраўніком групы Людмілай Аляксандраўнай Шаўчэнка пабывалі ў музеі.

У кніжным кіёску паявілася «Займальная граматыка». І Юра Сапажкоў ужо стаіць перад групай і даказвае неабходнасць яе журналісту.

Дружба згуртавала студэнтаў групы, зрабіла іх адзінай сям'ёй. А ў дружбы спорыцца вучоба, радасным і цікавым становіцца юнацкае жыццё.

Аляксандр **АМЕЛЬЧАНКА**

# Скарга пяці кніжак

*«Нас пяць. І ўсе мы сяброўкі. Жывём ва універсітэцкай бібліятэцы. Чытачы любяць нас. Асабліва перад экзаменамі. Старонкі нашы тады чытаюць і ўздоўж і ўпоперак. Усе стараюцца захапіць чым пабольш ведаў. Зубамі і алоўкамі ўгрызаюцца ў нашы старонкі, крэсляць нас. Ванда Пудзіноўская з 1 курса геафака, Тацяна Кур'яновіч з 5 курса філфака, Людміла Буланава, Аляксандр Арлоўскі з 2 курса біяфака, Дора Шнейдар з 4 курса матфака так любяць размалёўваць старонкі, што потым нас проста цяжка пазнаць. Сустрэлі неяк мы сваю сяброўку — падручнік па эстэтыцы. Замурзаная, абшарпаная. Сталі пытацца, што з ёй. І сяброўка горка заплакала: «На мне бліны Кур'яновіч Таня ела... Што цяпер са мной будзе? Навошта я такая цяпер чытачам?».*

*Мы стараліся заспакоіць яе. Але дзе там! Скора прыйшлі другія пакрыўджаныя кніжкі: «Абарані нас, Даніла, ад такіх чытачоў, якія па-варварску адносяцца да нас! Не дай у крыўду. Напішы аб іх».*

*Тут і прыйшлося Данілу Шылу даць работу свайму пяру.*

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белгаспрофа.
АТ 03797. Тыр. 2000. Зак. 1391.